ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 297 (1264) ЧАЦЬВЕР, 25-га сьнежня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 "
6 месяцаў	1 р. 80 "
1 год	3 р. 30 "

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Аб перавыбарах саветаў

Рэзолюцыя па дакладах т. т. КАЛІНІНА і МОЛАТАВА, прынятая аб'яднаным пленумам ЦК і ЦКК УсеКП(б) 21-га сьнежня 1930 г.

1. Палітычнае значэньне новых выбараў у саветы заключаецца ў тым, што цяперашнія перавыбары павінны стаць важнейшым сродкам карэннай перабудовы на справе ўсёй работы саветаў, перабудовы ў адпаведнасьці з задачамі рэконструкцыйнага пэрыоду. Калі ў адносінах да профсаюзаў, ахапляючых толькі пролетарыят, партыя ў ажыцьцяўленьні гэтай задачы дабілася ўжо некаторых посьпехаў, хоць яшчэ зусім невыстарчальных, то ў адносінах саветаў, ахапляючых побач з рабочымі і працоўных вёскі, ёсьць асабліва вялікае адставаньне ў перабудове іх работы прыстасоўна да патрабаваньняў пэрыоду соцыялістычнай рэконструкцыі.

Неабходная-ж перабудова работы саветаў можа адбыцца толькі на аснове падняцьця ролі саветаў як правадніком генэральнай лініі партыі, непрымірыма варожай як у адносінах правага, так і ў адносінах „левага" опортунізму. Падняць ролю саветаў у правядзеньні на практыцы ленінскай політыкі партыі—такая асноўная політычная задача перавыбарчай кампаніі.

2. Падзеі апошніх месяцаў і, перш за ўсё, факты ўздыму соцыялістычнага будаўніцтва ў СССР, пры адначасовым далейшым паглыбленьні сусьветнага экономічнага крызісу і абвастрэньні клясавых супярэчнасьцяй у капіталістычных краінах,—цалкам пацьвярджаюць правільнасьць пастаноў XVI зьезду партыі. Ухваленая партыйным зьездам політыка разгорнутага соцыялістычнага наступленьня па ўсім фронце з посьпехам ажыцьцяўляецца ўсё больш умацоўваючы саюз рабочай клясы і сялянства, у масе сваёй стаўшага на шлях колектывізацыі і разам з тым усё больш абвастраюцца формы супраціўленьня з боку капіталістычных элемэнтаў (кулацтва, нэпманы, буржуазная інтэлігенцыя). Пры гэтым, чым з большым посьпехам пролетарыят Савецкага Саюзу разгортвае соцыялістычнае наступленьне, тым больш контррэволюцыйныя элемэнты ўнутры краіны (ад Рамзіна і Кандрацьцева да меншавікоў, Громана і Суханава ўключна) ставяць стаўку на інтэрвэнцыю чужаземных імпэрыялістых у СССР. Адказам рабочых і сялян на падрыхтоўку інтэрвэнцыі супроць краіны саветаў павінна быць яшчэ больш пасьлядоўнае і яшчэ больш рашучае наступленьне соцыялізму па ўсім фронце і ўсямернае ўзмацненьне абароназдольнасьці краіны. Політычны зьмест і баявыя лёзунгі гэтага наступленьня даны XVI зьездам партыі і цяперашнім аб'яднаным пленумам ЦК і ЦКК. Пад сьцягам гэтых пастаноў партыі і павінны прайсьці перавыбары саветаў.

3. Пры перавыбарах саветаў павінна быць шырока разгорнута праверка правядзеньня і далейшага разьвіцьця справы ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай політыкі, узмацненьне інтэрнацыянальнага адзінства і супрацоўніцтва ўсіх народаў СССР і разьвіцьцё іх нацыянальных па форме і пролетарскіх па зьместу культур.

4. Пераможнае будаўніцтва соцыялізму ў краіне Саветаў знаходзіць сваё найбольш яркае выяўленьне ў пасьпяховым ажыцьцяўленьні лёзунгу „Пяцігодка—у чатыры гады". Ажыцьцяўляецца ня толькі прыняты партыяй шпаркі тэмп індустрыялізацыі, але—і гэта асабліва важна—і політыка ліквідацыі кулацтва як клясы на аснове суцэльнай колектывізацыі сялянскіх гаспадарак.

Тым самым СССР робіць гіганцкі крок уперад па шляху зьнішчэньня клясаў, па шляху непасрэднага будаўніцтва соцыялізму.

Процэс перабудовы дробнага вытворства, які зараз адбываецца, з заменай яго буйнымі колектыўнымі гаспадаркамі, стварае для савецкай улады ў вёсцы новую вытворчую базу, базу буйнай гаспадаркі. Будучы дзіцем буйных пролетарскіх цэнтраў, саветы толькі цяпер, толькі на базе шпаркага ўзрастаючай буйнай вытворчасьці ня толькі ў горадзе, але і ў вёсцы, змогуць поўнасьцю выявіць усе каштоўныя ў пролетарскай дыктатуры магчымасьці, унутраныя і міжнародныя, у справе барацьбы за перамогу соцыялізму. Гэта азначае таксама, што цяпер у вялізарнай ступені ўзрасьлі прадпасылкі для паскораньня пераходу больш адсталых раёнаў, напрыклад, некаторых нацыянальных вобласьцяй савецкага Ўсходу, на шлях соцыялістычнага разьвіцьця.

Усё гэта падкрэсьлівае неабходнасьць рашучай і хутчэйшай перабудовы саветаў у адпаведнасьці з карэннымі задачамі цяперашняга пэрыоду соцыялістычнага будаўніцтва.

5. Для таго, каб забясьпечыць гэту перабудову, саветы ва ўсёй сваёй рабоце павінны на справе абаперціся на створаны ўжо новы масавы актыў і перш за ўсё на ўдарнікаў фабрык і заводаў і на колгасьнікаў у вёсцы. Гэты новы і зараз ужо асноўны савецкі актыў стаў рашаючай сілай ва ўздыме соцыялістычнай індустрыі і сельскай гаспадаркі на аснове суцэльнай колектывізацыі і павінен таксама стаць у цяперашніх умовах апорай партыі і саветаў у справе карэннага палепшаньня ўсяго дзяржаўнага апарату і ў першую чаргу ў справе палепшаньня савецка-коопэрацыйнага апарату забясьпечаньня (харчы, прамтавары).

Апіраючыся на гэты савецкі актыў і разгортваючы далей работу сярод ударнікаў і колгасьнікаў, а таксама работу па організацыі беднаты, саветы забясьпечаць пад кіраўніцтвам партыі вялізарнае ўзмацненьне сваёй сувязі з масамі і ўцягненьне новых мільёнаў рабочых і сялян у шэрагі актыўных будаўнікоў соцыялізму. Для гэтага неабходна, каб саветы па сапраўднаму павярнуліся тварам да ўдарніцтва, тварам да колгасаў.

6. Для таго, каб на справе правесьці карэнную перабудову работы саветаў, трэба забясьпечыць безумоўнае правядзеньне ленінскай лініі партыі бяз права і „лева" опортуністычных скажэньняў савецкай лініі ў савецкай практыцы і перш за ўсё ў практыцы кіруючых органаў саветаў.

У пэрыод разгорнутага соцыялістычнага наступленьня партыя асабліва ня можа мірыцца з праваопортуністычнай практыкай у кіраўніцтве савецкімі органамі, якая (практыка) ня толькі незабясьпечвае прынятых бальшавіцкіх темкаў будаўніцтва і пасьлядоўнай барацьбы з бюрократызмам на аснове разгорнутай пролетарскай самакрытыкі, але на справе азначае сабатаваньне, а часамі і просты зрыў важнейшых дырэктыў партыі. Таму ў цяперашніх умовах ня можа быць месца правым опортуністым і беспрынцыпным прымірэнцам у кіруючых органах саветаў. Толькі на аснове сапраўды непрымірымага змаганьня з праваопортуністычнай практыкай, да гэтага часу яшчэ нярэдкай ня толькі ў мясцовых саветах, але часткова і цэнтральных органах дзяржапарату, можна і безумоўна трэба ўзьняць ролю саветаў у практычным правядзеньні генэральнай лініі партыі ва ўсім соцыялістычным будаўніцтве.

7. Перавыбары саветаў павінны ўнесьці карэнныя палепшаньні ў самы склад саветаў. Першае месца ў саветах павінна належаць лепшым ударнікам у рабочых цэнтрах, перадавым колгасьнікам—у вёсцы, як партыйным, так і беспартыйным. ЦК і ЦКК напамінаюць важнейшае для саветаў указаньне Леніна: „Мы кепска праводзім лёзунг: вылучайце беспарыйных, правярайце беспартыйнымі работу партыйных" (Ленін, т. XVIII, ч. 1, стар. 342). У часе перавыбараў у справе вылучэньня ў саветы беспартыйных рабочых і колгасьнікаў, а таксама аднаасобнікаў з беднякоў і серадьнякоў і асабліва ў справе вылучэньня работніц, сялянак і моладзі неабходна дабіцца сур'ёзьнейшага зруху з тым, каб, як у гарадзкіх саветах, так і раённых выканкомах, беспартыйным было поўнасьцю забясьпечана належнае месца. Пры гэтым зразумела, што не павінна быць фактаў выпадковага „вылучэньня" такіх „беспартыйных", якія ня толькі ня маюць ніякага падтрыманьня з боку працоўнай масы, але і проста зьяўляюцца соцыяльна-чужымі элемэнтамі,—гэта сьведчыла-б толькі аб нездавальняючасьці сувязі з масамі ў кіруючых органах гэтых парторганізацый і саветаў.

8. Цяперашнія перавыбары саветаў маюць асабліва вялікае значэньне для вёскі ў сувязі з правядзеньнем у апошнія месяцы ліквідацыі акруг і з перанясеньнем цэнтру цяжкасьці работы партыі і савецкай улады ў раёны. Гэтым створаны важнейшыя прадпасылкі да набліжэньня партыйнага і савецкага апарату да мас, да вёскі, да колгасаў, а таксама да больш своечасовай праверкі ідучых на месца ўказаньняў з боку абласных і цэнтральных органаў. Перавыбары павінны замацаваць праведзеныя меры па ўзмацненьню саветаў і іх органаў у раёнах і, з прычыны яўнай невыстарчальнасьці прынятых пакуль што ў гэтых адносінах мерапрыемстваў, забясьпечыць далейшае ўсямернае ўзмацненьне партыйна-савецкімі кадрамі раённых органаў. З боку абласных, рэспубліканскіх і саюзных органаў саветаў павінна быць аказана вялікая дапамога і садзейнасьць раёнам, асабліва па лініі ўстанаўленьня належнай сувязі і канкрэтнага кіраўніцтва, а таксама палепшаньня матар'яльна-культурных умоў работы ў раёнах.

9. У справе разьвіцьця пролетарскага дэмократызму савецкая дзяржава мае значныя дасягненьні. Так, рост соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва на заводах і фабрыках і ў колгасах, а таксама прыняцце масамі сустрэчных прамфінплянаў зьяўляецца выяўленьнем новых і прытым вышэйшых форм савецкай дэмократыі. Неабходна таксама падтрымаць і ўсяляк разьвіваць кантроль рабочых і сялян зьнізу над работай дзяржапарату (напр., групавыя абсьледаваньні савецкіх органаў пад кіраўніцтвам РСІ, брыгады рабочых па азнаямленьню з работай устаноў) і новыя формы добраахвотнага ўдзелу рабочых у выкананьні дзяржаўнай работы (напрыклад, па міліцыі). Разам з тым, неабходна ў рабоце саветаў дабіцца цьвёрдага правядзеньня рэжыму экономіі ў дзяржапараце і большай актыўнасьці ў вырашэньні штодзенных, бытавых і культурных запатрабаваньняў працоўных (забясьпечаньне, жыльлёвая, комунальная справа). Для гэтага, побач з узмацненьнем дысцыпліны і адказнасьці ў дзяржорганах, трэба з яшчэ большай рашучасьцю і настойлівасьцю разгарнуць на аснове пролетарскай самакрытыкі барацьбу з бюрократызмам у савецкім апараце. Дасягнутыя ў гэтай галіне посьпехі яшчэ зусім невыстарчальны і таму барацьба з бюрократызмам у савецкім апараце і забясьпечаньне сапраўднай праверкі выкананьня прынятых партыяй і савецкай уладай пастаноў—важнейшая задача партыі і ўсіх сапраўды актыўных удзельнікаў соцыялістычнага будаўніцтва.

Перавыбары саветаў, якія ўцягваюць усю масу рабочых і працоўных сялян у справу праверкі політыкі і ўсёй практычнай работы савецкай улады, зьяўляюцца адным з асноўных сродкаў разьвіцьця савецкага дэмократызму, г. зн. далейшага ўзмацненьня актыўнасьці мас па ўсёй справе соцыялістычнага будаўніцтва. Асабліва гэта неабходна іменна цяпер, калі рабочая кляса прыступае да ажыцьцяўленьня заданьняў трэцяга году пяцігодкі—рашаючага году для безумоўнага ажыцьцяўленьня пяцігодкі за чатыры гады.

З гэтымі задачамі мы справімся з тым большым посьпехам, чым актыўней уся маса рабочых і працоўных сялян, а таксама жонкі рабочых, служачыя, хатнія работніцы, саматужнікі і інш. будуць прымаць удзел у новых выбарах у саветы. Сапраўды актыўны ўдзел пролетарыяту і ўсяе масы працоўных у перавыбарах забясьпечыць на справе патрэбны зрух у перабудове работы саветаў і тым самым будзе важнейшым крокам у справе ўзьняцьця ролі саветаў і правядзеньні на практыцы ленінскай політыкі партыі.

Інстытут Леніна

Урывак з артыкулу Леніна

„РЭВОЛЮЦЫЙНАЯ АРМІЯ І РЭВОЛЮЦЫЙНЫ ЎРАД“

МАСКВА. Інстытут Леніна апублікаваў невядомы раней урывак з артыкулу Леніна.

„Рэволюцыйная армія і рэволюцыйны ўрад".

Соцдэмократыя ніколі не глядзела на вайну з сантымэнтальнага пункту погляду. Беспаваротна асуджаючы войны, як зьверскія спосабы рашэньня лёсаў чалавецтва, соцыялдэмократыя ведае, што войны няўхільны, пакуль грамада дзеліцца на клясы, пакуль існуе эксплёатацыя чалавека чалавекам. А для зьнішчэньня гэтай эксплёатацыі нам не абыйсьціся без вайны, якую пачынаюць заўсёды і паўсюды самі эксплёатуючыя, пануючыя і прыгнятаючыя клясы. Ёсьць вайна—авантура, здавальняючая інтарэсы дынастыі, апэтыты рабаўнічай шайкі, гэрояў капіталістычнай нажывы. Ёсьць вайна—і гэта адзіная законная вайна ў капіталістычнай грамадзе—супроць прыгнятальнікаў і эксплёататараў народу. Толькі ўтопістыя і філістэры могуць прынцыпова асуджаць такую вайну, толькі буржуазныя здраднікі волі могуць ухіляцца цяпер у Расіі ад гэтай вайны, вайны за волю народу.

Пролетарыят пачаў у Расіі гэтую вялікую вызваленчую вайну. Ён здолее працягваць яе, стварыўшы атрады рэволюцыйнай арміі, падмацоўваючы атрады перайшоўшых к нам салдат або матросаў, прыцягваючы сялян, напаўняючы новых грамадзян Расіі, якія формуюцца і загартоўваюцца ў агні грамадзянскай вайны, гэройствам і энтузіязмам барацьбітоў за волю і шчасьце ўсяго чалавецтва.

Артыкул „Рэволюцыйная армія і рэволюцыйны ўрад" быў напісаны Леніным у першых лічбах ліпеня 1905 году ў сувязі з паўстаньнем на браняносцы „Пацёмкін". Гэты ўрывак мае грунтоўнае значэньне і ўяўляе сабою вялікі інтарэс для сучаснасьці. Ён уняты ў сэкцыі дакумантаў і матар'ялаў за 1905 год, якія публікуюцца і выходзяць гэтымі днямі ў 17 ленінскім зборніку.

Распаўсюджваньне электрапісьменнасьці—галоўная задача электрашэфства

ЦК ЛКСМБ абвясьціў 22 сьнежня—днём электрафікацыі

У сувязі з прыняцьцем шэфства па электрафікацыі Савецкага Саюзу, ЦК УсеЛКСМ вынес пастанову, у якой гаворыцца:—„22 сьнежня споўнілася 10 год з таго часу, калі 8-мы зьезд Саветаў прыняў дзяржаўны плян электрафікацыі Расіі—плян ГОЭЛРО. Гэты плян, складзены пад кіраўніцтвам Леніна, зьявіўся першым плянам аднаўленьня і соцыялістычнай рэконструкцыі народнай гаспадаркі Савецкай краіны. **Плян ГОЭЛРО ў асноўным выкананы.**

Цэнтральны камітэт УсеЛКСМ пастанаўляе прыняць шэфства комсамолу над электрафікацыяй Савецкага Саюзу. Прыступіць да разгортваньня пропаганды ідэй электрафікацыі, мобілізуючы ўвагу шырокіх пластоў працоўных на справу электрафікацыі краіны. **„Навучыцца самім і навучыць падрастаючае працоўнае пакаленьне ня толькі разумець, што такое электрычнасьць, але і як тэхнічна прыкласьці яго да прамысловасьці і земляробства".** Гэтая задача, пастаўленая перад намі Ільлічом, павінна быць поўнасьцю выканана.

Комсамольцы павінны стаць застрэльшчыкамі шырокага абгаварэньня проектаў новых электрастанцый сярод рабочай і сялянскай моладзі, змагаючыся за скарачэньне тэрмінаў проектаваньня і будаўніцтва станцый. Галоўнейшай задачай электрашэфства зьяўляецца распаўсюджваньне электрапісьменнасьці, організацыя гурткоў электратэхнічных ведаў, электраконсультацый, выданьне масавай таннай літаратуры.

У заключэньне ў пастанове гаворыцца: „22-ае сьнежня—дзень зацьверджаньня пляну ГОЭЛРО—павінна быць абвешчана днём электрафікацыі. Штогод у гэты дзень павінны падводзіцца вынікі нашых дасягненьняў і недахопаў у галіне электрафікацыі. Комсамольскія організацыі ў гэты дзень правяраюць сваю работу па электрашэфству, намячаюць далейшыя мерапрыемствы для яго разьвіцьця і ўмацаваньня.

Чэкістыя вітаюць ЦК УсеКП(б)

МАСКВА, 22. ЦК УсеКП(б) атрымаў прывітальную тэлеграму ад урачыстага сходу ленінградзкіх чэкістых, прысьвечанага 13-ай гадавіне ВЧК-ДПУ. У тэлеграме гаворыцца: „Ленінская цьвёрдасьць і рашучасьць Цэнтральнага Камітэту ў правядзеньні рашэньняў 16-га зьезду партыі, бязьлітасная барацьба на два фронты—супроць правых і „левых" опортуністых—стварылі сталёвую монолітнасьць партыйных шэрагаў і далейшае бурнае разьвіцьцё соцыялізму. Ленінградзкі атрад АДПУ, пад кіраўніцтвам Ленінградзкага Абласнога Камітэту, у цеснай сувязі з рабочаю клясай і працоўнымі, задачы аховы заваў Кастрычніцкай рэволюцыі на сваім вучастку выканаў. Ня гледзячы на што, гнёзды контр-рэволюцыянэраў і шкоднікаў і ў далейшым будуць выкрывацца і зьнішчацца. Супраціўленьне кулацтва будзе зламана. У барацьбе за генэральную лінію УсеКП(б) чэкістыя былі, ёсьць і будуць у першых шэрагах.

Няхай жыве УсеКП(б)—правадыр рабочае клясы!

Няхай жыве Цэнтральны Камітэт партыі і яго правадыр тав. Сталін!

Няхай жыве сусьветная рэволюцыя!

УПАРТА БУДАВАЦЬ КУЛЬТУРУ
НАЦЫЯНАЛЬНУЮ ПА ФОРМЕ І СОЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ ПА ЗЬМЕСТУ
НЕ ПАСЛАБЛЯЮЧЫ АГНЮ ПА КОНТРРЭВОЛЮЦЫЙНЫМ НАЦЫЯНАЛ-ДЭМАКРАТЫЗЬМЕ, БЯЗЬЛІТАСНА БІЦЬ ПА ВЯЛІКАДЗЯРЖАЎНЫМ РАСІЙСКІМ ШОВІНІЗЬМЕ

Пастановы ЦК УсеЛКСМ аб удзеле комсамолу ў нацкультбудаўніцтве Гомельскай гарадзкой організацыяй выкананы ў нязначнай частцы

Рэзолюцыя

бюро гаркому ЛКСМБ па матар'ялу, зьмешчанаму ў „ЧЗ“ ад 18-га і 19 сьнежня 1930 г.

Абгаварыўшы матар'ял, зьмешчаны ў „Чырвонай Зьмене“ ад 18 і 19 сьнежня 1930 году аб удзеле комсамольскай організацыі ў нацыянальна-культурным будаўніцтве, бюро гаркому комсамолу адзначае:

ЦК УсеЛКСМ у сваіх рашэньнях аб становішчы беларускай організацыі адзначыў:—„Задачай ЛКСМБ зьяўляецца змаганьне з усялякімі адхіленьнямі ад правільнага вырашэньня нацыянальнай політыкі партыі, змагаючыся з праявамі вялікадзяржаўнага шовінізму, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, контррэволюцыйным нацдэмократызмам і шовінізмамі іншых колераў“.—Праз гэта і на гэтым грунце ЦК УсеЛКСМ прапанаваў уцягваць масы комсамольцаў, рабоча-сялянскай моладзі Беларусі ў актыўны ўдзел у будаўніцтве нацыянальнай культуры па форме і соцыялістычнай па зьместу. Гэта пастанова набывае выключна важнае значэньне ў пэрыод разгорнутага наступленьня соцыялізму па ўсім фронце, выкарчоўваньні карэньняў капіталізму і ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай колектывізацыі, мобілізуючы масы комсамольцаў і рабочай моладзі на перадавыя вучасткі барацьбы за генэральную лінію партыі.

Бюро Гаркому комсамолу адзначае, што гэтыя важныя політычныя рашэньні аб удзеле комсамольскай організацыі ў нацкультбудаўніцтве Гомельскай гарадзкой організацыяй выкананы ў нязначнай частцы. Пастанова ЦК УсеЛКСМ аб рабоце ЛКСМБ не даведзена ў асноўным да комсамольскіх ячэек гораду і кожнага комсамольца паасобку. Організацыя была слаба мобілізавана на ажыцьцяўленьне рашэньняў ЦК УсеЛКСМ.

Адзначыць, што ня гледзячы на шэраг пастаноў Брюро Гаркамолу ў справе аўладаньня марксыска-ленінскімі прынцыпамі ў нацпытаньні ва ўзброеньні комсамольскай організацыі ведамі беларускай мовы, гэтыя рашэньні да сёньнешняга дня шэрагам комсамольскіх ячэек ня выкананы. Тэмпы правядзеньня месячніку беларусізацыі ў організацыі слабы, шэраг комсамольскіх ячэек недаацанілі політычнага значэньня правядзеньня месячніку беларусізацыі (савпартшколы, чыгуначны тэхнікум, Сельмаш, Ланцукі, 9 вучастак цягі).

Бюро Гаркамолу разглядае факты невыкананьня з боку паасобных ячэек і актывістых дадзеных дырэктыў па аўладаньню белмовай,—адным з сродкаў узмацненьня дыктатуры пролетарыяту,—як просты сабатаж да правядзеньня ленінскай нацполітыкі, як праяўленьне на практыцы вялікадзяржаўнага шовінізму. На аснове гэтага, бюро Гаркамолу катэгорычна прапануе ўсім ячэйкам і комсамольцам неадкладна прыняць рашучыя меры да выкананьня дадзеных раней дырэктыў партыйных і саюзных органаў.

Бюро Гаркамолу лічыць зусім своечасовымі і політычна вернымі сыгналы „Чырвонай Зьмены“ аб політычных прарывах на фронце ўдзелу гарадзкой організацыі на нацыянальна-культурнаму будаўніцтву.

Вакол гэтых прарываў (вылазкі вялікадзяржаўных шовіністых у ФЗВ чыгуначнікаў, 9 вуч. цягі, чыгуначным тэхнікуме, лясным тэхнікуме і і інш., так і нацыяналдэмократычныя вылазкі ў савпартшколе і шэраг антысэміцкіх і шовіністычных вылазак) неабходна мобілізаваць комсамольскую організацыю на яшчэ больш бязьлітасную і рашучую барацьбу супроць усякіх ухілаў ад генэральнай лініі партыі ў нацпытаньні і ў першую чаргу на барацьбу з вялікадзяржаўным шовінізмам, як галоўнай небясьпекай.

Бюро Гаркамолу ўхваляе пастанову сходу комсамольскай ячэйкі савпартшколы ад 9-XII па пытаньню адносна комсамольскай ячэйкі да вылазак нацыяналдэмократаў у школе (пастаноўка нацдэмаўскай п'есы „Перамена“). Разам з гэтым бюро ГК адзначае, што з боку Бюро Гаркамолу ў справе вылазак нацдэмаў у савпартшколе дапушчана грубейшая політычная памылка, якая выявілася ў тым, што бюро Гаркамолу, ведаючы становішча ячэйкі і яе прымірэнчыя політычна-шкодныя адносіны да вылазкі клясавых ворагаў, на гэту справу не рэагавала, на бюро ня ставіла пытаньня аб політычных памылках ячэйкі савпартшколы і не орыентавала ўсю організацыю для ўзмацненьня барацьбы за чыстату генэральнай лініі партыі ў правядзеньні нацполітыкі.

Ня гледзячы на некаторы зрух у гарадзкой організацыі ў справе пастаноўкі на прынцыповую політычную вышыню значэньня зносін з беларускай і нацменаўскай пролетарскай літаратурай, узмацненьня сувязі з філіяй БелАПП'у, усёж-ж гэта галіна працы за апошнія часы саслабла. Гаркамол і паасобныя комсамольскія ячэйкі не зьвяртаюць належнай увагі на дапамогу філіі БелАПП'у, стаяць у баку ад закліку ўдарнікаў у літаратуру.

Выходзячы з усяго гэтага, бюро Гаркому комсамолу пастанаўляе:

1. Па позыцыі комсамольскай ячэйкі савпартколы да вылазкі нацдэмаў:

а) за дапушчаныя політычныя памылкі і прымірэнчыя адносіны з боку бюро і ўсёй комсамольскай ячэйкі савпартшколы да контррэволюцыйных вылазак нацдэмаў у савпарашколе, бюро ячэйкі савпартшколы, як праявіўшае політычную сьлепату—распусьціць. Старому складу бюро абвясьціць вымову. Сэкратару ячэйкі, т. Лявіціну, за політычную недаацэнку ролі комсамольскай ячэйкі ў савпартшколе—даць суровую вымову. Даручыць члену бюро ГК ЛКСМБ, т. Палею, да 26 сьнежня правесьці выбары бюро комсамольскай ячэйкі;

б) паставіць пытаньне перад Гаркомам партыі аб адсутнасьці партківраўніцтва і замазваньні політычнага значэньня і ролі комсамольскай ячэйкі ў савпартшколе з боку партколектыву.

2. а) Склікаць агульна-гарадзкі актыў на 22 сьнежня, дзе абгаварыць пытаньне аб сыгналах „Чырвонай Зьмены“, у сувязі з прарывамі па ўдзелу організацыі ў нацыянальна-культурным будаўніцтве, і аб рашэньнях бюро ГК, на падставе гэтых матар'ялаў, аб вылазках вялікадзяржаўных шовіністых у паасобных ячэйках і прымірэнчых адносінах да гэтых вылазак ячэйкі ЛКСМБ савпартшколы.

б) Прапанаваць ячэйкам на чарговых сходах абгаварыць вурокі спраў (аб якіх пісала „Чырвоная Зьмена“), а таксама, на аснове становішча ў ячэйках, вызначыць і правесьці конкрэтныя мерапрыемствы па сапраўднаму ўдзелу організацыі ў нацыянальна-культурным будаўніцтве.

в) Бюро Гаркому комсамолу лічыць неабходным усю працу ў час правядзеньня месячніку шчыльна зьвязаць з працай выязной рэдакцыі і брыгадамі „Чырвонай Зьмены“. Вынікі працы, праробленай у час правядзеньня месячніку беларусізацыі, падвесьці на пашыраным пленуме Гаркому комсамолу.

Гэтую пастанову зьмясьціць у друку.

„У адказ шкоднікам дадаткова правядзем падпіску на пазыку „пяцігодка ў 4 гады“

Заслухаўшы інформацыю аб выкрыцьці і арышце групы буржуазных інтэлігентаў нацыянал-дэмократаў, конфэрэнцыя чытачоў г. Петрыкава патрабуе жорсткага пакараньня падрыхтоўшчыкаў інтэрвэнцыі супроць СССР. Мы запэўніваем компартыю і яе Ленінскі ЦК КП(б)Б, што пад яе кіраўніцтвам мы і далей будзем працаваць над выкананьнем пяцігодкі ў чатыры гады і колектывізацыяй сельскай гаспадаркі; у адказ шкоднікам будзем узмацняць абароназдольнасьць краіны.

Пры выбарах саветаў органаў дыктатуры пролетарыяту—абярэм адданых справе соцыялістычнага будаўніцтва лепшых рабочых, батракоў, беднату і колгасьнікаў, і дапаможам ім у выкананьні чарговых гаспадарча-політычных кампаній, як нарыхтоўкі, мобілізацыя сродкаў і інш.

Мы яшчэ больш узмацнім барацьбу з ухіламі ад генэральнай лініі партыі.

Конфэрэнцыя лічыць неабходным у адказ шкоднікам дадаткова правесьці падпіску на пазыку „Пяцігодка—ў чатыры гады“ па прадпрыемствах, арцелях, установах гораду.

По даручэньню чытачоў—
Пінчук В. М.

Вечар дзелавой дружбы

Спатканьне дэлегацыі расійскіх савецкіх пісьменьнікаў з савецкімі пісьменьнікамі Беларусі

У Менск прыехала з Масквы дэлегацыя Фэдэрацыі Організацый Савецкіх Пісьменьнікаў. У дэлегацыю ўваходзяць т.т.: Гладкоў, Кірылаў, Багданаў, М. Коласаў і прадстаўнік „Литературной Газеты“—Рэст. Дэлегацыя прыбыла ў Менск дзеля таго, каб запрасіць савецкіх пісьменьнікаў Беларусі на беларускі тыдзень, які праводзіцца ў Маскве з 3-га па 10-е студзеня, і, па-другое, дзеля наладжаньня яшчэ шчыльнейшай еднасьці—савецкай літаратуры РСФСР з савецкай літаратурай БССР.

Дэлегацыя ФОСП наведала Наркомасьветы, дзе мела вялікую гутарку з наркомам тав. Платуном, потым была ў БДУ, дзе знаёмілася з організацыяй унівэрсытэту і пастаноўкай у ім работы.

23-га сьнежня, у доме пісьменьніка адбыўся шырокі вечар спатканьня дэлегацыі ФОСП з рэволюцыйнымі пісьменьнікамі і мастакамі Савецкай Беларусі. Тав. Ліманоўскі пазнаёміў дэлегацыю расійскіх пісьменьнікаў з той вялізарнай работай, якая праводзіцца ў Беларусі па будаўніцтву соцыялістычнай культуры — пролетарскай па зьместу і нацыянальнай па форме, з тэй руйнуючай барацьбою, якую вёў і вядзе БелАПП з беларускім контррэволюцыйным нацыянал-дэмократызмам і галоўнай небясьпекай вялікарасейскім шавінізмам. Потым з вялікай надзвычайна цікавай прамовай выступіў старшыня дэлегацыі, вядомы пісьменьнік Т. Гладкоў (аўтар твораў „Цэмэнт“, «Галавалогі чалавек» і іншых). Перадаўшы прывітаньне ад ФОСП і запрасіўшы беларускіх пісьменьнікаў у Маскву на „тыдзень“, тав. Гладкоў сказаў:

— Мы жывем у нявідана-бурную эпоху будаўніцтва разгорнутых форм соцыялізму. У гэтай вялікай рабоце савецкія пісьменьнікі павінны ісьці ў першых шэрагах.

Тав. М. Коласаў, (аўтар вядомых комсамольскіх аповесьцяй і апавяданьняў) вітаў сход ад перадавога атраду ФОСП—Расійскай Асоцыяцыі Пролетарскіх Пісьменьнікаў.

Выступалі таксама т.т.: Кірылаў, Багданаў (ад сялянскіх пісьменьнікаў) і Рэст („Лит. Газета“).

У адказных словах на прамовы дэлегацыі т.т. Цішка Гартны і Сяркевіч горача віталі расійскіх пісьменьнікаў і падкрэсьлілі вялізарнае політычнае значэньне тэй дзелавой сувязі, якая зараз узмацняецца паміж пролетарскімі культурамі РСФСР і БССР.

У канцы вечару была наладжана вялікая і багатая літаратурная мастацкая частка.

Тэорэтычнае абгрунтаваньне нацыянал-дэмократычнай практыкі

Для кожнай практыкі неабходна мець тэорэтычную базу, якая-б падмацоўвала, кіравала і давала напрамак у разьвязваньні тых ці іншых практычных пытаньняў. Смоліч паставіў сваёй мэтай, хаця рамкі яго „працы“ і не дазвалялі гаварыць аб усім, адказаць хаць-бы патроху на ўсе пытаньні, якіх патрабавала нацыянал-дэмократычная практыка.

Смоліч такім чынам, пачынае ў сваёй брошуры „Тыпы географічных краявідаў Беларусі“:

— „Супольныя ўсёй Беларусі рысы краявіду дазваляюць злучаць усю ў адну географічную краіну... асабліва—чалавека, які на ўсёй прасторы Беларусі належыць у пераважнай большасьці да аднае нацыі, гаворыць адной моваю, мае аднолькавую матар'яльную і духоўную культуру (?! С. В).. прыклад, беларуская вёска, яе бадаўніцтва і знадворны выгляд, якія ўпаўне-ж у значнай меры вызначаны нічым іншым, як прыродаю краю“. (стар. 165). „Беларусь спрадвеку сядзіць на сваёй зямлі і гісторыя не памятае на Беларускім прасторы значнейшых неславянскіх тубыльцаў“.

„Что-то слышится родное“ толькі ня ў доўгіх песьнях Пушкінскага „Ямщика“, а ў кваканьні нацдэма Смоліча. Смоліч абгрунтоўвае думку, што ад прыроды краю залежыць эканоміка і культура вёскі і што на прасторах Беларусі жылі і могуць жыць толькі людзі, якія належаць да аднае нацыі і да аднае мовы. Гэта значыць: „Беларусь—толькі для Беларусаў“.

Ня будзем спрачацца з Смолічам у якой ступені прыродныя ўмовы ўплываюць на разьвіцьцё вытворчых сіл. Важна паказаць, што хаваецца за гэтымі, з дазволу кажучы, „тэорэтычнымі“ абгрунтаваньнямі Смоліча. Галоўнае ў нацыянал-дэмократычных сьлёзах Смоліча месьціцца ў тым, што нацыя, па яго думцы, „гаворыць аднэй мовай, мае аднолькавую матар'яльную і духоўную культуру“. Для контр-рэволюцыянэра нац.-дэма Смоліча важна давесьці адсутнасьць клясавай барацьбы, ён яра выступае супроць марксысцкіх установак аб тым, што ў кожнай нацыі ёсьць дзьве нацыі: нацыя прыгнечаных і прыгнятальнікаў; у кожнай культуры ёсьць дзьве культуры —культура пролетарская і буржуазная. У культуры Радзівілаў, Дунінаў-Марцынкевічаў і кулацтва, з аднаго боку, і культуры рабочага і бедняка-селяніна, з другога, ня толькі няма нічога супольнага, але гэтыя культуры клясава-процілеглыя. Сваёй формулай Смоліч сьцірае соцыяльную розьніцу культуры і ва ўмовах дыктатуры пролетарыяту—у краіне Саветаў, імкнецца працоўныя колы насельніцтва (рабочых і сялян) накіраваць па сьцежцы змаганьня не за сваю пролетарскую, а за клясава-варожую буржуазную культуру.

Вось аб чым марыў закарузлы нац.-дэм. Смоліч—„савецкі“ вучоны ў авечай скуры.

Усе вышэй падачыя меркаваньні Смоліча вядуць да таго, што гістарычнае разьвіцьцё Беларусі абумоўлена ня клясавымі супярэчнасьцямі і клясавай барацьбой, а географічнымі ўмовамі, самой прыродаю,—што беларусы самабытны. Па Смолічу, беларусамі могуць быць толькі каталікі і праваслаўныя. Аўтар гэтага артыкулу—беларус, а такіх як і ён вельмі шмат беларусаў, якія не належаць ні да якой рэлігіі, яны — бязбожнікі. Якраз іх і не прызнае за беларусаў „вучоны муж“.

Надзвычайна цікавую клясыфікацыю дае Смоліч насельніцтву ў кнізе „Курс географіі Беларусі“. Да групы сялянства адносяцца лясныя рабочыя, а да групы рабочых—рамесьнікі. Такая градацыя соцыяльных груп насельніцтва зьяўляецца бязумоўна не навуковай, хаця яе і пісаў акадэмік. У аснову гэтай градацыі Смоліч палажыў від працы, матар'ял, над якім працуюць, а не грамадзкія адносіны чалавека да чалавека, якія складаюцца ў процэсе вытворчасьці. Дзякуючы такой кваліфікацыі, кулак і абшарнік-памешчык (аб іх нідзе не гаворыцца) папалі ў групу сялянства, а рамесьнік, прыватнік сродкаў вытворчасьці, папаў у групу рабочых.

Цяпер паслухаем, што квакае Смоліч аб беларускай культуры.

„Вышэйшыя школы існавалі ў Беларусі ў першай палове XIX веку (Віленскі Унівэрсытэт, Гарыгорацкі Зямельны Інстытут, Полацкая Акадэмія)... Толькі ў часе вайны пачала адражацца беларуская школа; значна пашырацца пачала яна пасьля рэволюцыі. У нашым часе маем ужо толькі ў аднэй БССР 4 вышэйшыя школы; адноўлен закрыты праз 60 год Гарыгорацкі сельска-гаспадарчы Інстытут, які перароблен у Беларускую сельска-гаспадарчую акадэмію, адкрыт у Менску Беларускі Дзяржаўны Унівэрсітэт і Комвуз“ (у Віцебску ветэрынарны інстытут).

Нацыянал-дэмократычныя банкроты хочуць апраўдаць сваю нікчэмную і ўбогую тэорыю самабытнасьці культуры тым, што як быццам наша савецкае культурнае будаўніцтва праходзіць пад сьцягам іх тэорыі, зьяўляецца прадоўжнікам беларускай самабытнасьці, культурай Радзівілаў і Сапегаў, што савецкія вышэйшыя навучальныя ўстановы і школы фабрычна-заводзкай і колгаспай моладзі зьяўляюцца прадоўжнікамі навучальных устаноў мінулага і школ „пашаніўскай“ пары. „Видит око, да зуб неймет“. Нікчэмнасьць гэтых паклёпніцкіх „довадаў“ відавочна.

Савецкія культурныя рассаднікі, нацыянальныя па форме, а соцыялістычныя па зьместу, ні ў якай залежнасьці ад пералічаных Смолічам культурных устаноў мінулага не знаходзяцца і ня могуць знаходзіцца. Ранейшая культура была па сваёй сутнасьці дваранскай-буржуазнай. Сучасная савецкая соцыялістычная, пролетарская; яе творыць пролетар, які пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі ў 1917 годзе зьмёў з твару зямлі будаўнікоў буржуазнае культуры, і зараз пераможна будуе соцыялізм, будуе пролетарскую па-свайму зьместу культуру, выкідаючы на сьметнік буржуазныя нацыянал-дэмократычныя нахадкі.

С. ВЯЗІН.

(Працяг будзе).

Сьмялей крочыць уперад!

Адышоўшы ад голага культурніцтва, правёўшы вялікую барацьбу з рэкордсмэнствам--фізкультура не заняла яшчэ адпаведнага месца ў барацьбе за пяцігодку, перабудова фізкультруху праходзіць марудна, нясьмелымі крокамі

Узьняць тэмпы, ахапіць фізкультурай максымальную колькасьць працоўных, зрабіць яе неадлучнай часткай соцыялістычнага будаўніцтва і абароназдольнасьці краіны—чарговая задача партыйна-комсамольскіх, профэсыйных і фізкультурных організацый

Перабудавацца ў найкарцейшы тэрмін

Мінула ўжо больш году пасьля пастаноў Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б) аб фізычнай культуры. Дэкрэт усесаюзнага ўраду ад 3-га красавіка г. г. чотка азначыў значэньне і месца фізкультурнага руху ў СССР у рэконструкцыйны пэрыод. Усе дзяржаўныя і грамадзкія організацыі, у той ці іншай ступені зацікаўленыя ў разьвіцьці фізкультурнага руху, атрымалі зусім конкрэтныя задачы.

Асноўная і галоўная задача ўсёй фізкультурнай работы, гэта—у найкарацейшы тэрмін перабудавацца так, каб максымальна служыць соцыялістычнаму будаўніцтву і ўмацаваньню абароны СССР.

У сьвятле гэтай устаноўкі практычнае дзейнасьць утворанага пры прэзыдыуме ЦВК СССР Усесаюзнага Савету Фізычнай культуры і разгортваецца перабудова фізкультруху. Дэкрэт саюзнага ўраду азначыў фізкультурную работу, як справу „першаступеннай дзяржаўнай важнасьці", непасрэдна зьвязаную і вынікаючую з агульных задач рэконструкцыйнага пэрыоду. Сур'ёзная ўвага, якую цэнтральныя дырэктыўныя органы ўдзяляюць фізкультурнаму руху, тлумачыца тым, што соцыялістычнае наступленьне і неабходнасьць усямернага ўмацоўваньня абароны Савецкай краіны, патрабуюць шырокага разьвіцьця фізычнай культуры, як фактару, які павялічвае сілы мільёнаў працоўных, што штурмуюць пасьпяхова цяжкасьці на шляху ажыцьцяўленьня пяцігодкі ў 4 гады.

Аднак, яшчэ ня ўсюды на фізычную культуру працоўных зьвернута неабходная ўвага. Органы дзяржаўнага кіраўніцтва фізычнай культурай яшчэ ня ўсюды пастаўлены ва ўмовы, якія-б забясьпечылі магчымасьць здавальняюча выконваць гэтую задачу. Бесклапотныя, халодныя адносіны да фізкультурнага руху, з боку паасобных організацый, недаацэнка яго дзяржаўнага значэньня ў гады рашаючай барацьбы за соцыялізм, часьцяком тармозяць работу.

Асноўная маса савецкіх фізкультурнікаў на рашэньне кіруючых органаў партыі і савецкай улады аб фізкультуры адказала мобілізацыяй усяе энэргіі, разгортваньнем соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва для хутчэйшага зьнішчэньня перашкаджаючых фізкультурнаму руху недахопаў.

Творчы энтузіязм і ініцыятыва мас пасьпяхова пераналаюць цяжкасьці і набліжаюць той момант, калі фізычная культура ў краіне саветаў стане непадзельнай, органічнай часткай соцыялістычнага будаўніцтва і абароны краіны.

Пашыраны пленум Вышэйшага Савету Фізычнай Культуры Беларусі павінен падагуліць першыя вынікі ажыцьцяўленьня перабудовы фізкультурнай работы ў адпаведнасьці з рашэньнямі партыі і Саюзнага ўраду. У БССР яшчэ вельмі мала зроблена для рэалізацыі гэтых рашэньняў. Пленуму прадстаіць на аснове пролетарскай самакрытыкі ўскрыць недахопы і прычыны, якія іх параджаюць. Фізкультурныя організацыі БССР, якая знаходзіцца на мяжы з капіталістычным сьветам, павінны заняць месца ў перадавых шэрэнгах фізкультурнікаў СССР.

Няхай армія фізкультурнікаў Савецкай Беларусі поўнасьцю ўвальлецца ў шэрагі ўдарнікаў соцыялістычнага будаўніцтва. Пажадаем пленуму пасьпяхова вырашыць намечаныя задачы і як найхутчэй падпарадкаваць фізкультуўны рух задачы барацьбы за бальшавіцкія тэмпы соцыялістычнага будаўніцтва.

Член прэзыдыуму ВСФК СССР і інспэктар фізпадрыхтоўкі РСЧА Б. КАЛЬПУС.

Усебеларуская лыжная эстафэта да X зьезду саветаў

Усебеларуская лыжная эстафэта, організуемая ВСФК праводзіцца ўпяршыню і зьяўляецца вялікім грамадзка-політычным мерапрыемствам. Эстафэта прысьвечваецца X усебеларускаму зьезду саветаў і ставіць сваёй асноўнай мэтай:

— дастаўку X Усебеларускаму зьезду саветаў рапартоў мясцовых, дзяржаўных і грамадзкіх організацый аб выніках справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў у Беларусі;

— падвядзеньне вынікаў удзелу фізкультурных організацый БССР у справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў, агітацыя за выкананьне 3-га году пяцігодкі, за падрыхтоўку да вясновай сяўбовай кампаніі, за колектывізацыю вёскі і абароназдольнасьць краіны саветаў;

— праверку фізычных дасягненьняў (вынослівасьці) лыжнікаў.

Усебеларуская эстафэта павінна зьявіцца масавым мерапрыемствам, ахопліваючым усе раёны БССР. Эстафэта ў асноўным падзяляецца на тры этапы: у першым этапе павінны ўдзельнічаць нізавыя вясковыя, колгасныя, вытворчыя гурткі, пачынаючы ад сельсаветаў, колгасаў, саўгасаў—да раёнаў, у другім этапе ўдзельнічаюць лепшыя каманды ад раёнаў да куста (усяго ў БССР мяркуецца ў час эстафэты ўстанавіць 15 кустоў, у якіх адбудзецца перадача эстафэты прыбываючых каманд з раёнаў); трэці этап—ад куста да г. Менску.

Пачатак эстафэты прызначаецца на 22 студзеня—дня організуемых ВСФК СССР, лыжных прабегаў, прысьвечаных справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў на пераходны прыз імя ЦВК СССР.

Перадача эстафэты на другім этапе орыентовачна прызначана на 15 лютага. Перадача эстафэты X усебеларускаму зьезду саветаў адбудзецца 24 лютага ў г. Менску.

Ва ўсебеларускай эстафэце, пачынаючы ад сяла, колгасу, саўгасу і да горада Менску, прымуць удзел звыш 1000 чалавек працоўных фізкультурнікаў.

Для кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеньнем эстафэты, пры ВСФКБ і ўсіх саветах фізкультуры на мясцох утвараюцца організацыйныя камітэты з удзелам прадстаўнікоў шырокай грамадзкасьці (профсаюзы, КСМ, ваенвед, „Дынамо", прамкооперацыя і г д.).

Да падрыхтоўкі і правядзеньня эстафэты павінна быць мобілізавана ўвага мясцовых, профсаюзных і вайсковых організацый, ячэек і камітэтаў ЛКСМБ, ячэек ТДАвіяхіму, аддзелаў „Дынамо". У час правядзеньня эстафэты, на ўсіх этапах, пад непасрэдным кіраўніцтвам партыйных, комсамольскіх і савецкіх організацый, будуць організаваны мітынгі працоўных. Мітынгі будуць прысьвечаны эстафэце і перадачы рапартоў аб выніках справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў і працоўных дасягненьнях соцыялістычнага будаўніцтва раёну к X усебеларускаму зьезду саветаў БССР. Па скончэньні эстафэты лепшаму раёну будзе прысуджаны пераходны прыз імя ЦВК БССР на падставе наступных палажэньняў:

— За большую колькасьць працоўных прыцягнутых да ўдзелу ў эстафэце па розных маршрутах у межах раёну;

— За большую колькасьць і лепшую падрыхтоўку рапартоў раёну—дастаўленых X Усебеларускаму зьезду саветаў;

— За лепшы ўдзел па масавасьці і якасьці грамадзка-політычнай работы, праробленай фізкультурным організацыямі БССР у час справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў.

На падставе гэтых-жа палажэньняў, двум лепшым саветам фізкультуры ў гарадох і тром—у раёнах будуць таксама выданы прэміі ВСФКБ.

Раёны, атрымаўшыя прыз ЦВК БССР і прэміі ВСФКБ, будуць прадстаўлены ВСФК СССР у агульны конкурс лепшых раёнаў Савецкага Саюзу для ўзнагароды лепшага раёну пераходным прызам ЦВК СССР



Фізкультзарадку—у цэх!

Стварыць сапраўдны паварот

(Да пленуму ВСФК Беларусі)

Пашыраны пленум Вышэйшага савету ФК Беларусі сабраўся ў пэрыод, калі ўся ўвага і практычная работа партыі і працоўных мас БССР накіравана і цалкам падпарадкавана задачам разгорнутага соцыялістычнага наступу па ўсім фронце.

Работа пленуму павінна будзе прайсьці пад знакам аналізу праверкі, наколькі ФК рух Беларусі за гэты адцінак часу справіўся з задачамі, якія ўскладзены на яго рашэньнямі партыі і ўраду, як у галіне масавага ахопу шырокіх пластоў рабочых, колгасьнікаў, бядняцка-батрацкага і серадняцкага насельніцтва фізкультурай, так і ў тым сэнсе, наколькі ён перабудаваўся адпаведна з грамадзка-політычнымі задачамі бягучага пэрыоду, наколькі фізкультрух зьяўляецца сапраўдным сродкам, органічна зьвязаным з задачамі політычна-культурнага выхаваньня працоўных мас, організацыі іх на выкананьне баявых задач партыі.

Фізкультрух Беларусі да другога свайго пленуму ВСФК, пасьля рашэньняў ЦК УсеКП(б) і ўраду, падыходзіць з наяўнасьцю значнага пералому ў разьвіцьці і перабудове фізкульт работы. Факты і лічбы гавораць самі за сябе. Узрост у вытворчых гуртках фізкультуры ў параўнаньні з мінулым годам павалічыўся з 11248 чалавек да 17558 чал., агульная колькасьць рабочых у профсаюзных гуртках складае 70 проц.

Колькасьць фізкультурнікаў па вёсцы павялічылася з 6779 чалавек да 1 845 чалавек (ня поўны вучот). Гэты рост у вёсцы за апошні час у асноўным ішоў па лініі разьвіцьця гуртковай і масавай фізкультурнай работы ў соцсэктарах (колгасах і саўгасах). Вясковых фізкультурнікаў-колгасьнікаў налічваецца зараз 4461 чалавек.

За гэты час узрасла політычная актыўнасьць мас фізкультурнікаў. У час вясновай сяўбовай кампаніі брыгадамі фізкультурнікаў, у агульнай колькасьці каля 4000 чалавек, было ачышчана звыш 100000 пуд. насеньня. Акрамя гэтага, фізкультурнікі праз розныя формы прымалі актыўны ўдзел у справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў, колектывізацыі, хлебазагатоўках і іншых відах грамадзка-політычнай працы.

За мінулы час зроблен рашучы паварот фізкультруху тварам да вытворчасьці. Практычна выявілася гэта ў форме масавага ўцягненьня фізкультурнікаў ва ўдарныя брыгады і ў разявіўшыйся соц, спаборніцтва паміж фізкультурорганізацыямі па вытворчай лініі. У складзе рабочых-фізкультурнікаў мы зараз маем 5600 ударнікаў, частка якіх прэміявана. Фізкультурнікі часта выступаюць ініцыятарамі ўдарных брыгад. Зараз мы маем па вытворчасьці 12 ініцыятыўных груп фізкультурнікаў.

Аднак, тэмпы разьвіцьця і перабудовы фізкультруху на Беларусі яшчэ далёка адстаюць ад агульных тэмпаў і задач соцыялістычнага будаўніцтва, а на паасобных участках—цэлы шэраг вялікіх недахопаў і політычных прарываў.

Перабудова фізкультруху па вытворчаму прынцыпу яшчэ зусім слаба разгорнута. Фізкультура зусім слаба прасунута на прадпрыемствы і ў цэхі. Зарадавая гімнастыка, як асноўная масавая форма аздараўленьня працоўных, праводзіцца толькі ў адзінкавых найбольш буйных прадпрыемствах, а такія формы масавай работы, як заводзкія спартакіяды, экскурсіі і г. д., бадай што зусім не праводзяцца.

Членаў профсаюзаў па Беларусі налічваецца каля 260000 чалавек, з іх займаецца фізкультурай толькі 17680 чал., што ў параўнаньні з агульнай колькасьцю членаў дае надзвычайна малы процант. Акрамя гэтага, зьмест работы вытворчых гурткоў фізкультуры яшчэ слаба падпарадкаваны задачам узьняцьця вытворчасьці працы, выкананьня прамфінпляну, зьнішчэньня прагулаў і іншых адмоўных хваробных зьявішчаў на прадпрыемствах. Побач з наяўнасьцю значнай колькасьці ўдарнікаў-фізкультурнікаў, маецца таксама і цэлы шэраг ілжэўдарнікаў, лодыраў, лятуноў і г. д. Кажучы аб шматлікіх недахопах у перабудове фізкультработы ў профсаюзах, ні ў якім разе нельга абмінуць таго, што кіраўніцтва фізкультработай пачынаючы ад ЦСПСБ і канчаючы нізавымі профорганамі (завкомамі, мясцкомамі) усё яшчэ зьяўляецца слабым і па якасьці не адпавядае задачам, якія пастаўлены перад фізкультрухам у профсаюзах. Большасьць кіруючых органаў бюро ФК пры ЦП саюзаў амаль што не працуюць і не стаяць на чале кіраўніцтва гэтай работай.

У выніку слабога, а часта і зусім дрэннага кіраўніцтва профсаюзаў фізкультурнай работай, нездавальняюча пастаўлена політычна выхаваўчая работа сярод фізкультурнікаў, слаба разьвіта самадзейнасьць, добраахвотнасьць, крытыка і самакрытыка, назіраецца шэраг хваробных зьяў: аполітычнасьць, вялікадзяржаўны і іншыя шовінізмы, чэмпіёнства, п'янства, антысэмітызм і г. д. Шэрагі фізкультурнікаў усё яшчэ далёка не ачышчаны ад соцыяльна-варожых нам элемэнтаў.

Тэмпы разьвіцьця і стан фізкультработы на вёсцы нездавальняючыя. Колькасьць працоўнага сялянства, якое ахоплена фізкультурай, у параўнаньні з агульнай колькасьцю сялянства БССР, складае толькі 0,23 проц. Тэмпы росту фізкультуры ў соцсэктары таксама надта слабыя. Фізкультработа на вёсцы вельмі часта праходзіць сэзонна і слаба падпарадкавана задачам соцыялістычнай перабудовы вёскі.

Недаацэнка політычнага значэньня фізкультуры ў сучасны пэрыод шэрагам мясцовых дзяржаўных і грамадзкіх організацый—вось асноўны тормаз у разьвіцьці і поўнай перабудове ФК руху ў адпаведнасьці з дырэктывамі партыі і ўраду. Дзяржаўныя і грамадзкія організацыі яшчэ часам глядзяць на фізкультуру, як на забаву, а не як на сродак, органічна зьвязаны з агульным соцыялістычным будаўніцтвам краіны. Адчуваецца зусім слабы ўдзел значнай часткі ведамсьцьвенных організацый як у кіраўніцтве, так і ў практычнай дапамозе ў галіне разьвіцьця і перабудовы фізкультработы. Цэлы шэраг раёнаў ня выканаў досыць поўных і яскравых дырэктыў партыі і ўраду аб фізкультуры цалкам, альбо зусім слаба іх ажыцьцяўляе.

Разьвіцьцё і перабудова фізкультруху шчыльна зьвязаны з пытаньнем аб кадрах, якія-б праводзілі цьвёрдую партыйную лінію ў гэтым руху. Ня гледзячы на значную падрыхтоўку за апошні час фізкультурных кадраў для БССР з ліку рабочых і працоўнага сялянства, усё-ж проблема кадраў намі далёка яшчэ ня вырашана. Сярод інструктароў фізкультуры ўсё яшчэ нязначны процант рабочых. Зусім слабая спэцыяльна-спортыўная тэхнічная падрыхтоўка. У значнай сваёй частцы шэрагі фізкультурнікаў засьмечаны соцыяльна-варожым элемэнтам—выхадцамі з былых дробна-буржуазных спортыўных організацый—макабі, сокалы, якія зараз стаяць у баку ад агульнага грамадзка-політычнага жыцьця і часам працягваюць у фізкультрух дробна-буржуазныя ідэйкі: аполітычнасьць, чэмпіёнства, рвацтва і г. д.

Аналізуючы фізкультрух у Беларусі, мы павінны канстатаваць, што раённыя саветы ФК у значнай сваёй частцы яшчэ не зьяўляюцца сапраўднымі органамі політычна-організацыйнага кіраўніцтва масавым фізкультурухам.

Пленум ВСФК павінен будзе прайсьці пад знакам далейшага ўзмацненьня фізкультруху ў Беларусі, узмацненьня кіруючых органаў руху—раёсаветаў фізычнае культуры, узмацненьня кіраўніцтва саветамі з боку мясцовых партыйных організацый, актыўнага ўдзелу профсаюзаў і комсамолу ў практычнай і непасрэднай рабоце як гурткоў, так і саветаў ФК.

Пленум павінен будзе падвесьці вынікі мінуламу году, даць агульны аналіз фізкультруху ў БССР, увязаўшы яго з агульным аналізам фізкультруху ў Савецкім Саюзе. На падставе вопыту пленум павінен будзе чотка намеціць програму дзейнасьці на будучы час, забясьпечыўшы сапраўднае правядзеньне ў жыцьцё асноўных задач, пастаўленых перад фізкультрухам партыяй і ўрадам.

Сабраўшыся напярэдадні X усебеларускага зьезду ЛКСМБ, пленум павінен будзе праверыць удзел мясцовых комсамольскіх організацый у перабудове фізкультруху з тым, каб на падставе гэтых вынікаў усебеларускі зьезд КСМ ужыў конкрэтныя мерапрыемствы, якія-б забясьпечылі пасьпяховае выкананьне дырэктыў ЦК УсеКП(б), УсеЛКСМ, ЦК ЛКСМБ, каб комсамольскія організацыі на мясцох (камітэты і ячэйкі) зьявіліся сапраўднымі ініцыятарамі фізкультработы і актыўна ўдзельнічалі ў кіраўніцтве фізкультрухам.

Пленум ВСФК, на падставе шырока разгорнутай крытыкі і самакрытыкі, па-баявому вырашыць усе пытаньні зьвязаныя з далейшым разьвіцьцём і перабудовай фізкультруху ў БССР якія вынікаюць з задач поўнага выкананьня дырэктыў партыі і ўраду аб фізкультуры.

...СКОЎСКІ.

У БОЙ ЗА ЛЕС

ПЛЯН ВЫВАЗКІ БУДМАТАР'ЯЛУ І ДРОЎ САРВАНЬ

ВЫВЕЗЕНА БУДМАТАР'ЯЛУ НА 4,9%, ДРОЎ—6,6%

Самахвалавіцкі РКП КСМБ і Леспрамгас ня выконваюць узятыя на сябе абавязкі па соцумове

Мобілізаваць усе сілы на выкананьне заданьняў ударнага кварталу як па загатоўцы, так і па вывазцы

Увагу комсамолу—на вывазку лесаматар'ялаў і дроў

Апошняя зводка Лесбелу аб ходзе выкананьня дрова-лесазагатовак (на 21-ае сьнежня заданьне па будматар'ялах выканана на 81,3 пр., дровах на 41,5 проц.) з усёй яскравасьцю гаворыць аб неабходнасьці самых, што ні на ёсьць, ударных тэмпаў, каб выканаць намечаныя для ўдарнага кварталу заданьні. За апошнія дні засталося загатовіць 517.509, к.-м., альбо 18,7 проц., будматар'ялу і 937.536 р-м., альбо 59,5 проц. дроў пляну ўдарнага кварталу.

Асабліва пагражаючае становішча мы маем з вывазкай загатоўленага лесаматар'ялу. Плян па вывазцы будматар'ялу на другую дэкаду выкананы толькі на 4,9 проц., што дае павялічэньне толькі на 0,6 проц., супроць першай дэкады. Такое самае становішча мы маем і з вывазкай дроў. На другую дэкаду плян па вывазцы выкананы на 6,6 проц., што дае павялічэньне на 1,2 проц.

Вышэйпаданыя лічбы выкананьня пляну па загатоўках дроў і асабліва вывазцы ўсяго лесаматар'ялу, б'юць трывогу

Патрэбна безадкладна мобілізаваць усю грамадзкасьць і ў першую чаргу ўвесь комсамол.

Зембінскі вучлесгас ганебна правальвае лесазагатоўкі

Кулацкім вылазкам не даюць ніякага адпору

Зембінскі вучлесгас, Плешчаніцкага леспрамгасу, ганебна адстае ў лесазагатоўках. Заданьне ў 38000 к. м. за апошнюю дэкаду (10 сьнежня) выканана толькі на 2000 к. м. Праца зрывалася з-за таго, што роўналежныя організацыі пераманьвалі працаўнікоў. Барысаў за апошні час пераманіў двух дзесятнікаў. Вузка-калейная чыгунка систэматычна павялічвае заробак з тым, каб пераманіць к сабе занятых на лесазагатоўках леспрамгасу сялян.

На квітках леспрамгасу чыгунка робіць свае адзнакі, што гэтыя сяляне выканалі гужпавіннасьць. Такое недапушчальнае зьявішча спрые рвацкім настроям і ў корні дэзорганізуе працу вучлесгасу. Плян лесазагатовак не кантролюецца і ны ўсюды даведзен да двара. Растлумачальнай працы аб політычнай важнасьці выкананьня лесазагадовак не праводзілася.

На агульных сходах сялян, якія праводзіліся леспрамгасам і членамі сельсавету, мелі месца контррэволюцыйныя вылазкі клясава-чужых элемэнтаў, якія агітавалі: „калі нам нічога не даюць, не дамо і мы". Такія выпадкі ня рэдкія.

Перш усяго, што гэтым вылазкам кулацтва прысутныя на сходах члены сельсавету і дзесятнікі леспрамгасу не далі рашучага адпору.

Усё гэта разам узятае прывяло да таго, што ў вадзе засталося больш 2500 к. м. лесу.

Партыйныя і грамадзкія організацыі толькі цяпер пачынаюць рухацца. Барысаўскі РК ЛКСМБ ня кіруе працай ячэек па лесазагатоўках.

Брыгадзір ЦК ЛКСМБ і „Ч. З."
Д. Смагаржоўскі.

Комсамол павінен быць мобілізаваны на выкананьне пляну лесазагатовак

Агромністае гаспадарча-політычнае значэньне пасьпяховага выкананьня пляну лесазагатовак і зьвязаныя з выкананьнем павялічанай програмы 1931 году цяжкасьці патрабуюць максымальнага напружаньня сіл з боку рабочых колгасных і батрацка-бядняцкіх мас вёскі, і ў першую чаргу комсамольскай і рабочай моладзі.

Лесазагатоўкі праходзяць ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы. Кулацтва і іншыя контррэволюцыйныя элементы імкнуцца сарваць пасьпяховае выкананьне пляну лесазагатовак, у чым ім дапамагаюць правыя і левыя опортуністыя ў партыі і КСМ, якія енчаць аб тым, што немагчыма выканаць узятыя тэмпы. Каб пасьпяхова выканаць програму лесазагатовак, неабходна ўсім лясным організацыям ЛКСМБ мобілізаваць на работу ў лесе ўсю комсамольскую масу і батрацка-бядняцкую-колгасную моладзь.

Сур'ёзная ўвага комсамольскіх організацый павінна быць зьвернута на выкананьне якасных паказчыкаў спаборніцтва. Комсамольцы ў лесе павінны быць застрэльшчыкамі і організатарамі ўдарных брыгад. Дабіцца ператварэньня цэлых дзялянак, вучасткаў і леспрамгасаў ва ўдарныя. Весьці барацьбу з ілжэўдарніцтвам, лятунствам і дэзэртырствам з працоўнага фронту (шляхам шырокага ўжываньня мэтадаў паказальных судоў, рабочых сходаў, друку і г. д.). Комсамольскія ячэйкі ў лесе павінны быць застрэльшчыкамі ў справе палепшаньня і організацыі грамадзкага харчаваньня, наладжваньня перасоўных ларкоў, устанавіць жорсткі кантроль за выкананьнем распарадку свачасовага забясьпечаньня і разьмеркаваньня харчоў і прадметаў шырокага спажываньня.

Ячэйка комсамолу павінна шырока разгарнуць культурна-масавую работу сярод рабочых і моладзі. Ужываць у рабоце ўсе мэтады заводзкіх організацый. Для правядзеньня ўсіх мерапрыемстваў у жыцьцё раённыя камітэты павінны правесьці правільную расстаноўку комсамольскіх сіл, асабліва актыву. Трымаць сталую сувязь з мобілізаванымі комсамольцамі і ячэйкамі ў лесе, узяць шэфства над паасобнымі леспрамгасамі, мобілізоўваць масы на конкрэтныя дасягненьні вучасткаў і брыгад.

Разгарнуць шырокую кампанію в тым, каб уцягнуць і на 100 проц. ахапіць работаю ў лесе батрацка-бядняцкую і колгасную моладзь.

Ва ўсёй рабоце на лесазагатоўках, комсамольскія організацыі, пад кіраўніцтвам партыі, павінны паказаць вузоры сапраўднага энтузіязму, працоўнай самаадданасьці і гэроізму для выкананьня важнейшых дырэктыў партыі.

Упаўнаважаны ЦК УсеЛКСМ
Л. Сабалеўскі.

Соцыялістычная ўмова ня выконваецца

Самахвалавіцкі РК ЛКСМБ яшчэ не закончыў мобілізацыю, Менскі леспрамгас ня выконвае сваіх абавязкаў

Нядаўна заключылі ўмову на соцспаборніцтва Менскі леспрамгас з Астрашыцка-Гарадоцкім, Самахвалавіцкім, Заслаўскім і Сьмілавіцкім РК ЛКСМБ на ліквідацыю лясных прарываў. З часу заключэньня ўмовы прайшло ўжо 10 дзён, а практычнага нічога ня зроблена.

Самахвалавіцкі РК ЛКСМБ узяў на сябе абавязак мобілізаваць да 26-XII—30 г. 24 комсамольцаў на лясны фронт, але гэты абавязак ня выкананы. Мобілізаваныя комсамольцы ўцяклі з лесу, бо Менскі леспрамгас таксама ня выканаў узятых на сябе абавязкаў аб забясьпечаньні мобілізаваных комсамольцаў жыльлём, інструмэнтам, спэцвопраткай і харчамі.

Ніхто ў раёне ня цікавіцца тым, каб зьнішчыць пагражаючае становішча з лесазагатоўкамі.

Райштаб і групы „ЛК", якія павінны адыграць выключную ролю ў ліквідацыі прарываў, пытаньнямі лесазагатовак не займаюцца.

Самахвалавіцкі райком ЛКСМБ павінен ліквідаваць лясныя прарывы і выканаць узятыя на сябе абавязкі.

Юнкораўскі пост „ЧЗ"
Лебядзевіч.
Пезьняк.
Сянькевіч.

Зрываюць загатоўкі экспортнага лесу

Буйнейшы з дзесяці вучасткаў Плешчаніцкага леспрамгасу, Вілейскі, 60 проц. заданьня якога разьлічана на экспорт, да апошняга дня застаецца без кваліфікаваных працаўнікоў. Пасьля катэгорычнага запатрабаваньня загадчыка вучлесгасу Леспрамгас вызначыў на працу ў Вілейскі вучастак тэхніка. Аднак гэты тэхнік перашоў на больш лёгкую працу ў Бягомель. Да сёньняшняга дня Вілейскі вучастак ня мае неабходных двух тэхнікаў па лесазагатоўках і лескультурах. Не хапае 20 кваліфікаваных рабочых.

Загадчык вучастку—вылучэнец, былы лясьнік—загружан партыйнай і савецкай працай у сельсавеце. Бягомельскі РК партыі за апошні час перакінуў з вучлесгасу 6 лепшых дзесятнікаў на профсаюзную і коопэрацыйную працу. Напр., перакінуў былога аб'ездчыка... на працу сакратара ТД-Авіяхэму.

Лагойскі РК ЛКСМБ да апошняга часу ня ўжыў ніякіх захадаў, каб уцягнуць комсамол у лесазагатоўкі і больш месяцу не адказваў на выклік Плешчаніцкага РК ЛКСМБ прыняць удзел у лепшым выкананьні лесазагатовак.

Ячэйкі Бягомельскага РК ЛКСМБ па ініцыятыве друку, у прыватнасьці „Ч. З.", самі пачалі працаваць па лесазатоўках.

Спажыв. коопэрацыя і леспрамгас не падрыхтаваны да вывазкі 75.000 к-м лесу.

Няма фуражу ня толькі для сялянскіх коняй, але і для свайго сталага абозу.

Брыгадзір ЦК ЛКСМБ
і „Ч. З." **Д. С-кі.**

Міх. Вярнікоўскі

2. АНЯМЕЛЫ ЗВОН

Нарысы пра Кіева-Пячэрскую Лаўру—цяперашні Ўсеукраінскі Музэйны Гарадок

Старая, абшарпаная брама. Некалі—некалі,—больш ня вернецца тая пара!—гэтая суровая брама маўкліва праводзіла мільёны палоньнікаў рэлігіі ў Лаўру і была тым прытульным месцам, куды зьбіралася трагічная плойма жабракоў і калек. Жорсткая, страшэнная прытульнасьці.

Падыйдзеце цяпер да гэтай грузнай, абшарпанай брамы. Яна прымушана цяпер гаварыць па-інакшаму, гэтая самавыкрывальніца. Яна вам сурова, як судзьдзя, што чытае прысуд, і разам з тым ветла, як любы, блізкі таварыш, мовай другіх, ужо абноўленых мільёнаў заявіць:

„Боротьба проти релігії—боротьба за соціялізм"...

І гэтаю дужаю, пераканаўчаю і надзвычайна гучнаю мовай—нашаю мовою—гаворыць, апавядае цяпер увесь вялікі пляц, на якім стагодзьдзямі вырасталі вялізарныя цэрквы, стромкія званіцы, грузныя муры—словам усё тое, што ў вогуле складала агідную Кіева-Пячэрскую Лаўру.



Так званая Надвратная царква, пабудаваная ў 1106 годзе

Зброя, якою царат на працягу цэлых стагодзьдзяў працярэбліваў сабе ў гушчах працоўных мас шляхі да нажывы, эксплёатацыі,—адабрана Кастрычнікам. Зброя, вырваная з рук ворага, абернута супроць яго-ж. Яна ёмка, бяз промаху сячэ, зьнішчае назаўсёды яшчэ моцныя ланцугі рэлігіі...

Пройдзеш праз браму—разьбягаюцца вочы.

Справа, на водшыбе, стаіць высачэзная грузная званіца. Яна мае ўвышкі 46 сажняў. Покуль ускарабкаешся па шматлікіх сьпіральных усходнях на гэтую боўдзілу, забаляць ногі і ў ліхаманцы заб'ецца сэрца (прынамсі, гэта здарылася са мной).

Дзіву даешся, калі бачыш дзесяткі званоў. Нейкі нявымоўны настрой авалодвае чалавекам, што ўзышоў на гэтую высачэзную званіцу. Хоць адным вухам прыслухайцеся да яго.

Рука неяк баязьліва дакранулася да вялікага, падобнага на зьвера звана, а энэргічны і ўпарты позірк, шпарка прабраўшыся праз вакно, неадчэпна ўпіўся ў даляглядь.

... Гэты звон, як і ўся Лаўра, пабудаваны на апошнія капейкі, вымотаныя з паўгалодных рабочых і сялян, прыдушаных крывавай жорсткай рукой цара. Звон у 1636 пудоў узьнялі на гэтую высокую званіцу гэтымі-ж самымі людзьмі. Звон на працягу доўгіх гадоў прыводзіў да пакоры гэтых-жа людзей, прымушаў іх верыць у цара-крывапіўцу, у няіснуючага бога, прымушаў цягнуць цяжар рэлігіі.

Праз шырозныя вокны гэтай агіднай званіцы вочы бачаць бязьмежна прыгожы і дарагі малюнак... Шумлівы прыгожы горад... Бойкая прыстань... Нядаўна ўзьведзеныя карпусы кінофабрыкі, 4 абутковай фабрыкі... Цэлы шэраг заводаў і фабрык... дымароў... мурроў... Па палёх пераможна крочыць трактарная калёна... Бяжыць шпарка і нястомна шумлівы Дняпро, якога там за вечна раздавзным і магутным ненасытцам, *) у Кічкасе закілзала наша рука дзеля таго, каб вырас Днепрабуд... Па вуліцах бегаюць трамваі. Калышуцца сьцягі... мітусяцца людзі... шмат людзей... І сонца... Гарачае—гарачае...

І робіцца горача.

Думаецца: навошта патрэбна было гісторыі праліваць гэтулькі людзкое крыві, каб потым з яе—гарачай і сапсаванай, узводзіць вялікія цэрквы, званіцы... Якая страшэнная памылка гісторыі!..

Але... але гэтая памылка трапна выпраўлена Кастрычнікам.

... Зьлезем з званіцы.

Пойдзем у Галоўную Усьпенскую царкву. Там нас чакаюць яшчэ больш жудасныя і яшчэ больш ашаламляючыя справы і рэчы царату.

(Працяг будзе).

*) Так завецца найбольш небясьпечны, галоўны дняпроўскі парог.

Паштовая скрынка

Еф. Ліпніцкаму—„Існуюць толькі на паперы", Міхасю—„Ударнікі", Патупчыку—„Годзе спаць", Славікоўскаму—„Зноў паказваюць сваё воўчае клычча", Пруцькову—„Жывую літаратуру ў масы", К. Карону—„Пад знакам рашучай барацьбы", В-э—„Пад знакам бязьлітаснай барацьбы", Барысу—„Аб колгасе „Новае Жыцьцё", Чарняўскаму—„Сарвалі конфэрэнцыю", Наймарку—„Аб кадрах", Комсамольцу—„Да Х-га зьезду ЛКСМБ", Кантару—„За 100 проц. уцягненьне працоўнае моладзі ў КСМ", і „30 чалавек у шэрагі КСМ", Р. К. —„Сустрэчны плян", Тураўскаму—„Комсамол Гомельшчыны напярэдадні Х зьезду ЛКСМБ, Сікорскаму—„Становішча Рэчыцкай організацыі", І. А.—Голас з месца", Усоўскаму і Лебядзевічу—„Ход райконфэрэнцыі", Плашчынскаму—„Прарыў у організацыі", Клябанаву—„Аб становішчы раённай організацыі па выпісцы газэт", Янковічу—„Падрыхтоўка да кастрычніка", Анціпёнку—„Кулакі працуюць, а партячэйкі сьпяць" і „Нажом па гораху", Ракоўскаму—„Ніводнай „ЧЗ", Дзябу—„Трывожныя сыгналы з Горак", Казлову і піонэру—„За выхаваньне маладога пакаленьня", М. Залатакуяру—„Ня месца такому ў комсамоле", Юрку—„Комсамольцы ў хвасьце жыцьця", Юнкору—„Вон такіх працаўнікоў", Л. Чаромху—„Зусім маленькая школа", „ня трэба рыхтавацца да сьвята", Групе ЛК—„Аб сьвяткаваньні Кастрычніка", Клачку З.—„Ці будзе прыліў у комсамол?" Лейціву—„Ня плоцяць сяброўскіх узносаў", Зайцаву—„Аб становішчы організацыі", Т. Карону—„Рыхтуемся да рай-конфэрэнцыі", Міхасю—„Комсамол Тураўшчыны стаяў у баку ад політычных кампаній", Комсамольцу—„Як мы сустрэлі сьвята", П. К.—„Перадавік", А. Рыбакову—„Кажуць, але ня робяць", К. Каролю—„Наладжваем провады", „Ячэйка плялася ў хвасьце моладзі", М. Раку—„Тут неабходзен агонь", М. Міхневічу—„Комсамол Грэцку на парозе 3-га году пяцігодкі", Пляшку—„Актыўная комсамолка", Вярнікоўскаму—„Ніводнага кроку ад ленінскага комсамолу", А-а—„Зьвярнеце ўвагу" і „За політсуд", М. Я.—„Аб комсамольцу Зьмітролоку", Пракопаву—„У межы прарыву", М. Плісковy—„Моладзь чакае", Вывараду—„Ударна правялі сходы моладзі", Я. Жылку—„Комсамол Случчыны да 5 райконфэрэнцыі", Галавачу—„Ячэйкі МОПР'у не працуюць", Студэнту—„Моладзь без газэт і чытальні", Юнкорам Лямчынку і Дорфману—„Год, як няма працы", Бурдо—„На новыя рэйкі", Сідарэнку—„Культурна-грамадзкая праца", П.П.Х.—„Конфэрэнцыя адчынілася", Комсамольцу К. Я.—„Аб кіраўніцтве Ярмінскай ячэйкі". Пералічаныя дописы ня пойдуць частка з іх спазьнілася, а рэшта для друкаваньня не падыходзіць.

АДКАЗНЫ РЭДАКТАР—РЭДКОЛЕГІЯ

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599